ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ




# КРЫЗІС ФІНАНСАВАННЯ НЕЗАЛЕЖНЫХ СМІ. ХТО МОЖА ДАПАМАГЧЫ?

Ганна Малаш, Марта Гардзей, Аляксей Івашкевіч

Цэнтр новых ідэй | Лістапад 2024

# РЭЗЮМЭ

Незалежныя беларускія СМІ пасля 2020-га года спазналі масавы пераслед і вымушаную эміграцыю. Штогод яны сутыкаюцца з новымі праблемамі. Адна з асноўных сёння – недахоп фінансавання. Скарачэнне сродкаў абмяжоўвае магчымасці для развіцця журналістаў. Гэта зніжае якасць кантэнту, што прыводзіць да страты аўдыторыі або прыпынення працы рэдакцыі.

Прэзідэнцкія выбары 2025-га года ў Беларусі пройдуць недэмакратычна. Без умяшальніцтва знешніх фактараў Аляксандр Лукашэнка, імаверна, застанецца ва ўладзе. Для незалежных СМІ гэта можа працягнуць няўстойлівае становішча на нявызначаны тэрмін. Такім чынам, беларусы рызыкуюць страціць незалежную журналістыку і пераключыцца на праўладныя медыі.

Мы прапануем разгледзець розныя варыянты падтрымкі незалежных медыяў з боку бізнесу. Гэта могуць быць як ананімныя ахвяраванні праз закрытыя асацыяцыі або пасярэднікаў, так і больш адкрытыя формы фінансавання праз адпаведны фонд. Зарэгістраваны як некамерцыйная ці дабрачынная арганізацыя, гэткі фонд мог бы аказваць дапамогу з празрыстай сістэмай размеркавання сродкаў на аснове заявак ад медыяарганізацый і меў бы спецыяльную камісію і назіральны камітэт.

Падтрымка з боку бізнесу істотна павысіла б устойлівасць і незалежнасць медыяў у перыяд далейшай палітычнай і эканамічнай нестабільнасці і забяспечыла б грунтоўную дапамогу ад беларусаў для беларусаў.

# ПРАБЛЕМАТЫКА

На хісткае становішча беларускіх СМІ ў выгнанні ўплывае недахоп стабільнага фінансавання. Большасць медыяў цалкам абапіраецца на грантавую падтрымку. Згодна з даследаваннем JX Fund (гл. с. 29), у 2023-ім годзе донарская дапамога складала каля 85% іх бюджэтаў.

Аднак сёння гэта ненадзейная і абмежаваная ў часе крыніца забеспячэння. З пачаткам вайны ва Украіне заходнія донары пачалі аб'ядноўваць гранты для медыяў без уліку культурных і палітычных адрозненняў між краінамі іх паходжання. Беларускія СМІ ўсё часцей разглядаюцца аднолькава з расейскімі, што можа ствараць няроўныя ўмовы канкурэнцыі.

Напрыклад, для атрымання гранта неабходны ахоп аўдыторыі не меншы за 1 мільён чалавек. У гэтым выпадку параўноўваць Беларусь з Расеяй, у якой насельніцтва болей ў 15 разоў, — некарэктна.

Паколькі расейскія недзяржаўныя медыі часта атрымліваюць буйнейшыя гранты, яны маюць большыя магчымасці для пашырэння і могуць замяніць беларускія СМІ. Так, яны могуць паспрабаваць даказаць донарам, што маюць досвед у асвятленні беларускай тэматыкі і гатовыя працаваць на шырэйшую аўдыторыю.

Да таго ж рэпрэсіўная палітыка ў Беларусі прывяла да прызнання большасці выданняў "экстрэмісцкімі", што крыміналізавала любое супрацоўніцтва з імі: зарабляць на рэкламе і легальна атрымліваць падтрымку ад чытачоў стала немагчыма.

Усё пералічанае ўскладняе сітуацыю, асабліва ў перыяд прэзідэнцкіх выбараў 2025-га, калі адсутнасць стабільнага фінансавання можа прывесці да далейшай манапалізацыі інфармацыйнага поля з боку дзяржаўных беларускіх і расейскіх медыяў. Яны могуць распаўсюджваць праўладныя наратывы, дэзынфармацыю, узмацняць культ асобы Лукашэнкі.

Пагаршае сітуацыю і геапалітычны кантэкст: расейская прапаганда здольная не толькі запоўніць інфармацыйны вакуум, але і ўплываць на фармаванне грамадскай думкі ў Беларусі (хаця і застаецца адкрытым пытанне — у якой ступені)[1].

Вядомыя ў Беларусі анлайн-апытанні Chatham House таксама закранаді тэму сітуацыі з медыямі (даследаванні праводзяцца прыкладна кожныя два-чатыры месяцы і ахопліваюць рэпрэзентатыўную выбарку гарадскога насельніцтва ў памеры каля 800 чалавек). Сацыёлаг Рыгор Астапеня, які кіруе гэтым праектам, адзначае, што сабраныя дадзеныя паказваюць скарачэнне аўдыторыі незалежных СМІ ў Беларусі (цягам года з 24% да 16%) і адначасовы рост уплыву дзяржаўных медыяў, якія аднавілі свае пазіцыі пасля крызісу 2020-га года. Пры гэтым у апытаннях пад катэгорыі дзяржаўных і недзяржаўных СМІ ўвайшлі як беларускія, так і расейскія медыі.

1. У лютым 2024-га БАЖ правяла чарговы маніторынг прарасейскай прапаганды на беларускіх тэлеканалах "Беларусь 1", АНТ і СТВ. У прайм-тайм (з 19:00 да 24:00) на "Беларусь 1" тэлепрадукцыя, выраблена ў Расеі або з яе ўдзелам, складала 25,7% сюжэтаў, 57,13% эфірнага часу; на АНТ – 59,2% і 45,9% адпаведна; на СТВ – 22,3% і 48,2%. У выніку каля 50% прайм-тайму беларускіх тэлеканалаў займаў расейскі кантэнт.




Паводле аднаго з даследаванняў Chatham House, праведзенага ў 2023-ім, цікавасць беларусаў да расейскіх і беларускіх дзяржаўных медыяў – высокая: 40% і 54% адпаведна. У той жа час узровень даверу да незалежных СМІ абедзвюх краін аднолькавы – 27%, а розніца ў долях аўдыторыі мінімальная: з усіх апытаных 42% атрымліваюць інфармацыю з беларускіх і 38% з расейскіх незалежных медыяў.

Тут варта адзначыць, аднак, што фактар страху ў апытаннях на палітычныя і каляпалітычныя тэмы можа выяўляцца праз схільнасць рэспандэнтаў да нейтральных, праўладных або прарасейскіх адказаў.

У межах падсумавання: без устойлівага фінансавання незалежныя беларускія медыі знаходзяцца на мяжы закрыцця. Напрыклад, выданне Reform.news вымушана звярталася да краўдфандынгу праз адмову ў гранце, а партал Kyky.org увогуле цалкам спыніў працу з-за фінансавых праблем. Пашырэнне такіх выпадкаў можа мець сур’ёзныя наступствы для грамадства ў самой Беларусі і беларускай дыяспары, бо пазбавіць іх аб’ектыўнай інфармацыі.

# АНАЛІЗ МАГЧЫМЫХ ВЫРАШЭННЯЎ

Пераход журналістаў у блогерства забяспечыць свабоду дзейнасці і дасць прамы кантакт з аўдыторыяй, але абмяжуе ў магчымасцях і паўплывае на якасць кантэнту – знізіцца ўзровень прафесіяналізму, аб'ектыўнасці і разнастайнасці інфармацыі. А таксама гэта не пазбавіць ад цяжкасцяў, звязаных з манетызацыяй, – застанецца залежнасць ад падтрымкі падпісчыкаў, данатаў, рэкламы, спонсараў, а таксама ад саміх платформаў, такіх як YouTube, якія могуць змяняць правілы і памеры сваіх выплат.

Фінансаванне журналістамі ўласных медыяпраектаў з асабістых сродкаў пры ўмове, што занятасць у СМІ стане для іх грамадскай працай, а не крыніцай матэрыяльнага забеспячэння, можа дапамагчы захаваць незалежнасць выдання, аднак прывядзе да выгарання. І ў выніку аўтары цалкам могуць перайсці ў іншыя сферы дзейнасці, што створыць дэфіцыт кадраў у медыясферы.

Краўдфандынг уратуе ў крызісе, але не дасць стабільнага даходу, неабходнага для доўгатэрміновага планавання.

Стварэнне кааператыўных праектаў СМІ часова вырашыць праблему фінансавання, але можа прывесці да арганізацыйных цяжкасцяў у камандзе. СМІ могуць адрозніваца паводле ключавых кірункаў асвятлення канкрэтных тэмаў, стылю працы і падыходаў да падачы інфармацыі. Гэта можа стварыць дадатковыя выклікі для эфектыўнага супрацоўніцтва.

Нарэшце, фінансаванне з боку прыватнага сектара дае незалежным медыям найбольш стабільную фінансавую падтрымку і доўгатэрміновае партнёрства. Хоць і застаецца рызыка ўплыву спонсараў на рэдакцыйную палітыку, яе можна мінімізаваць з дапамогай кодэкса ўмоў супрацы. Акрамя таго, прыцягненне да фінансавання розных бізнесаў, аб'яднанне іх у фонд, – зніжае рызыкі залежнасці ад аднаго партнёра і павялічвае ўстойлівасць медыяў.

# РЭКАМЕНДАЦЫІ

Буйныя беларускія кампаніі і асацыяцыі прадпрымальнікаў за мяжой могуць разглядаць уклад у фінансаванне СМІ як частку карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, што ўмацуе іх рэпутацыю, а грамадства атрымае надзейную і якасную інфармацыю.

Чым гэта выгадна бізнесу? У першую чаргу, гэта ўплыў на дэмакратычныя працэсы і пабудову “здаровай” будучыні краіны. Калі падтрымка кампаніі адкрытая, гэта таксама паляпшае давер да яе сярод кліентаў і партнёраў.

Незалежныя СМІ даюць якасную аналітыку пра Беларусь, якая можа дапамагчы ацэньваць рызыкі і арыентавацца ў палітычна-эканамічнай сітуацыі ў краіне і вакол яе не толькі беларускаму бізнесу, але і яго замежным партнёрам, у тым ліку сярод дзяржаўных установ і НДА.

Каб захаваць бяспеку, спонсарства можа быць ананімным, у рамках закрытых асацыяцый і кааліцый або праз пасярэднікаў. У якасці дапамогі таксама можна разглядаць і аказанне бясплатных паслуг, напрыклад тэхнічнай дапамогі, распрацоўкі і падтрымкі сайтаў, дызайну, аптымізацыі кантэнту, кібербяспекі ды іншага.

З боку СМІ варта прадставіць прыватнаму сектару дакладныя планы выдаткоўвання сродкаў, паказаць як сацыяльныя, так і эканамічныя выгады ад падтрымкі незалежных медыяў.

Дзеля каардынавання дапамогі можна разглядаць стварэнне фонду, які аб'ядноўваў бы бізнесы. Ён мог бы быць адным са спосабаў наладзіць узаемаадносіны паміж прадпрымальнікамі і медыямі. Гэта не выключае магчымасці спансараваць СМІ ў індывідуальным парадку.

Фонд можа быць зарэгістраваны як некамерцыйная ці добраахвотніцкая арганізацыя. Ён мае выклікаць давер – для гэтага ў яго складзе мусіць быць камісія, якая размяркоўвае рэсурсы, і назіральны камітэт, які сачыў бы за дзейнасцю камісіі. Гэта неабходна ў тым ліку і для таго, каб не толькі "галоўныя" медыі забіралі сабе ўсе рэсурсы. Пажадана, каб

сярод прадстаўнікоў фонду былі публічныя фігуры. Справаздачы аб дзейнасці мусяць рэгулярна публікавацца, напрыклад раз у 3 месяцы. Яны мусяць быць празрыстымі і поўнымі, утрымліваць у сабе адказы на пытанні, якія ўзніклі падчас мінулых справаздач.

Для патэнцыйных донараў медыі могуць распрацаваць некалькі сцэнароў з варыянтамі дапамогі, напрыклад у выглядзе трох планаў фінансавання:

- “выжыванне” – неабходны мінімум, каб утрымаць супрацоўнікаў і не спыніць працы;
- “устойлівасць” – на тэрмін 6-12 месяцаў СМІ забяспечаныя ўсімі неабходнымі рэсурсамі;
- “будучыня” – медыі забяспечаныя ўсім неабходным і могуць укладваць дадатковыя грошы ў развіццё.

## ПАТЭНЦЫЙНЫЯ АДРАСАТЫ

Паводле звестак арганізацыі ABBA (Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой), на жнівень 2023-га года ў ЕЗ было зарэгістравана больш за 8 тысяч кампаній з беларускімі бенефіцыярамі, пры гэтым 74% з іх зарэгістраваныя ў Польшчы.

З дапамогай ABBA прыватнаму сектару можна растлумачыць, як фінансуюцца СМІ, якія ёсць патрэбы і чым яны могуць дапамагчы. Арганізацыя дэкларуе сваёй місіяй дапамогу і развіццё беларускага бізнесу. Яна абараняе інтарэсы прадпрымальнікаў у Польшчы, Літве, Латвіі, Эстоніі і ЗША. У верасні 2024-га года арганізацыя правodзіла ў Варшаве бізнес-форум.

Акрамя таго, IT-кампаніі не раз аказвалі дапамогу Украіне – вядомыя прыклады Andersen і Wargaming. Увогуле на 2024 год EPAM застаецца найбуйнейшым падаткаплатнікам у Літве. Гэтыя кампаніі таксама могуць прычыніцца да ўратавання беларускіх СМІ.

Пры выкананні ўсіх умоў бяспекі да збору можна заклікаць таксама прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Фінансаванне незалежных СМІ ў Беларусі сутыкаецца з сур'ёзнымі праблемамі, а сітуацыя пагаршаецца існымі рэпрэсіямі з боку ўладаў, адсутнасцю стабільнай падтрымкі і ростам уплыву праўладных і расейскіх медыяў. У гэтых умовах забеспячэнне інфармацыйнай разнастайнасці робіцца крытычна важным.

Мы прапаноўваем адзін з магчымых шляхоў для падтрымкі беларускіх медыяў у выгнанні – устойлівае фінансаванне з боку беларускага бізнесу. Стварэнне празрыстага фонду, уключэнне розных формаў падтрымкі, у тым ліку праз прыватныя інвестыцыі і дапамогу супольнасцяў, можа стаць ключавым крокам да фінансавай стабільнасці і захавання незалежных СМІ.

Медыям патрэбны бізнес, а бізнесу патрэбныя медыі. Наладзіць перарваную сувязь паміж двума інстытутамі будзе найлепшым выйсцем для ўсіх.

# АЎТАРЫ:

**Ганна Малаш** – журналістка

**Марта Гардзей** – сацыёлаг

**Аляксей Івашкевіч** – журналіст

---

ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ

**Цэнтр новых ідэй** – даследчы інстытут, які дапамагае грамадскім і палітычным актарам пабудаваць дэмакратычную і ўстойлівую Беларусь. Мы робім гэта праз правядзенне незалежных даследаванняў, узмацненне грамадскага дыялогу і падтрымку будучых лідараў.

*www.newideas.center*

Фота: Павел Крычко